НАВІНКІ КНІГАВЫДАННЯ

# ПРАЗ АДУКАЦЫЮ ДА КУЛЬТУРЫ




Не так даўно ў Гродне пабачыла свет вельмі карысная і каштоўная кніга. Выйшаў з друку другі выпуск навуковага зборніка «Працы кафедры беларускай літаратуры». У выданне ўвайшлі артыкулы, у якіх даследуецца творчасць пісьменнікаў Гарадзеншчыны, а таксама асэнсоўваюцца актуальныя праблемы беларускага літаратуразнаўства.

Значная ўвага надаецца актуальным пытанням выкладання беларускай літаратуры ў сярэдняй і вышэйшай школе, дзе разглядаюцца пытанні практыка-арыентаванай падрыхтоўкі спецыялістаў-педагогаў.

Выданне разлічана на літаратуразнаўцаў, выкладчыкаў ВНУ, настаўнікаў і студэнтаў.

Рэдакцыйная калегія:
Жук І.В., доктар філалагічных навук, прафесар;
Каяла У.І., кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
Руцкая А.В., дацэнт, заслужаны настаўнік РБ;
Грынько М.У., магістар гуманітарных навук;
дырэктар навуковай бібліятэкі ГрДУ імя Я.Купалы;
Тарасава С.М., магістар філалагічных навук.
Пад агульнай рэдакцыяй кандыдата філалагічных навук, дацэнта Лебядзевіча Д.М.

Рэцэнзенты:
Бельскі А.І., доктар філалагічных навук, прафесар;
Русілка В.І., кандыдат філалагічных навук, дацэнт.

Зборнік выдадзены гродзенскім выдавецтвам «ЮрСаПрынт»; у ім налічваецца 166 старонак.

Гродзенскае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі сардэчна віншуе аўтарскі калектыў з выхадам зборніка і лічыць яго каштоўным дапаможным сродкам у справе вывучэння і папулярызацыі літаратуры роднага краю. Тым больш, што сярод яго аўтараў члены СПБ, літаратуразнаўцы Аліна Эдмундаўна Сабуць, Святлана Мікалаеўна Тарасава, Алена Вітальеўна Руцкая, ганаровы сябра Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ Руслан Канстанцінавіч Казлоўскі, а таксама маладая таленавітая паэтэса і навукоўца Вікторыя Смолка.

**Прэс-служба СПБ-Гродна**